Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. Т. 2 / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2006. – С. 149

**МІНСКІ АНСАМБЛЬ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫКІ І ПЕСНІ “ЯРЫЦА”** Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка. Заснаваны ў 1990, з 2002 народны. Кіраўнікі: В.Раманцоў і І.Сінкевіч (з 1990 па 1993), М.Сірата (з 1993), А.Макаўчык (з 1995). У склад ансамбля ўваходзяць вакальная, інструментальная і танцавальная групы. У рэпертуары бел. нар. песні: каляндарна-абрадавыя (“Ігралі-свяцілі”, “Весела-ясна”, “А ў кусце, кусце” і інш.), сямейна-абрадавыя (“А ў полі тры крынічанькі”, “А ў полі дуб зялёны”, “Цячэ вада на быстрыню” і інш.), пазаабрадавыя (“Зайчыкі”, “А ў полі вярба”, А ў гародзе ярыца”, Ой, калі ж той вечар” і інш.), танцы, інструментальныя п’есы ў апрацоўцы М.Сіраты і інш. Калектыў – лаўрэат Рэспубліканскага фестывалю “Студэнцкая вясна” (Віцебск, 1997), дыпламант Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва “Сожскі карагод” (Гомель, 1997), удзельнік Міжнародных фестываляў студэнцкай музыкі (г. Бельфор, Францыя, 1999, 2000, 2002) і інш. Выступаў у Германіі, Ізраіле, Расіі і інш.

*А.В. Дрыгін*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ